***Свірыдзенка В. І.***, *кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антановіч Н. М.***, *кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Кафедра беларускага і рускага моваазнаўства факультэта пачатковай адукацыі*
*Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі

## II клас*

### *Сябар*

*1. Расшыфруйце слова і запішыце яго.*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 5 | 4 | 1 | 2 | 3 |
| р | а | с | я | б |

*Вертыкальнай лініяй падзяліце слова на склады.*

*2. Дапоўніце песеньку патрэбным словам.*

**Песенька Дзеда-барадзеда**

Я хаджу па белым свеце —
ваш найлепшы ______, дзеці,
і вядома нават мне,
што вы бачыце ўва сне.
Хто я? Дзед-барадзед,
абышоў белы свет,
а цяпер у ціхі час
завітаў да вас.

*Алесь Вольскі* [1, с. 16]

*3. Дапоўніце радок слоў блізкім па значэнні слоўнікавым словам.*

Дружбак, таварыш, прыяцель, с..брук, ______ .

*Устаўце патрэбную літару на месцы пропуску ў слове.*

*4. Прачытайце словы. Устаўце прапушчаныя літары.*

Сяб..р, с..броўка, с..бры.

*Дапоўніце скорагаворку патрэбным словам.*

Прыгожую кніжку Караліне
Падарылі __________ на імяніны.

*Міхась Пазнякоў* [2, с. 136]

*Навучыцеся правільна вымаўляць скорагаворку.*

*5. Прачытайце скорагаворку. Дапішыце прапушчаныя літары ў слоўнікавыя словы.*

**Лепшы кравец**

Спрытны, жвавы, вожык-зух
Сябруку пашыў кажух.
Ён кравец у лесе лепшы
І мя__ведзю сяб__р першы.

*Міхась Пазнякоў* [2, с. 112]

***Зух*** *— бойкі, удалы.*

*Выпішыце са скорагаворкі словы, якія маюць аднолькавае значэнне.*

### *Песня*

*1. Разблытайце «павуціну» і запішыце слоўнікавае слова.*




*Пастаўце націск у слове.*

*2. Дапоўніце калыханку патрэбнымі слоўнікавымі словамі.*

**Калыханка**

Выплыў ______ з-за аблок
залатою лодкай,
гэта да цябе, сынок,
едзе сон салодкі.
Будуць _____ ў сне іграць,
добрыя музыкі,
будзеш ты адпачываць
і расці вялікім.

*Міхась Пазнякоў* [1, с. 16]

***Словы для даведкі:*** песні, месяц.

*3. Разгадайце рэбус і запішыце слоўнікавае слова, якое ў вас атрымалася.*




*У слоўнікавым слове падкрэсліце літары, якія абазначаюць зычныя гукі.*

*4. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам.*

*Што аўтар лічыць сапраўдным скарбам?*

**Скарб**

— Што такое скарб?
Скажы мне, —
Сын аднойчы запытаў.
— Гэта — ________ нашы, сыне,
Што народ вякамі склаў.
Гэта — праца,
Рукі, сэрцы,
Што ствараюць і пяюць.
Гэта — дружба, мір,
Што ў свеце
Нас з табою берагуць.

*Міхась Пазнякоў* [3, с. 7–8]

***Скарб*** — рус. клад, сокровище.

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.

*5. Прачытайце прыказку. Дапоўніце яе патрэбным слоўнікавым словам.*

Салаўінымі ________*ямі* не будзеш сыты.

*6. Прачытайце. Дапоўніце верш патрэбным слоўнікавым словам.*

Я і рэчцы, і гаю
Гэту ________ спяваю:
— Зелянéнькі мой гай,
У сяло прыбягай.
Ад гарачага сонца
Ты мяне засланяй.
Рэчка, рэчка, ў спякоту
Ты цячы каля плоту.
Буду плаваць, ныраць,
На пяску загараць.

*Ніна Галіноўская* [4, с. 27–28]

***Гай*** *— невялікі лес, звычайна лісцёвы.*

*Раскажыце, як трэба паводзіць сябе на рацэ.*

### *Выйграць*

*1. Расшыфруйце слова і запішыце яго.*

| 5 | 4 | 1 | 2 | 6 | 3 | 8 | 7 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| р | г | в | ы | а | й | ь | ц |

*Вертыкальнай лініяй падзяліце слова на склады.*

*2. Якая літара «збегла» са слова? Злучыце яе з месцам пропуску ў слове.*

і  й

вы..граць

*Пастаўце націск у слоўнікавым слове.*

*3. Прачытайце словы па схеме. Запішыце іх. Падкрэсліце слоўнікавае слова.*




*Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.*

Бабуля марыць ____________ у латарэю. Аленка любіць ____________ на фартэпіяна.

*4. Прачытайце верш. Дапішыце прапушчаную літару ў слова.*

— Дзед Мароз,
Абуй валёнкі.
Пабяжым наперагонкі.
Пакажы спартыўны гарт.
Раз, два, тры! —
Выходзь на старт.
Паімчаўся Дзед Мароз!
Зараз вы__грае ён крос.

*Ніна Галіноўская* [4, с. 147]

***Гарт*** *— стойкасць, вынослівасць.*

*5. Падкрэсліце слова, процілеглае па значэнні да слова* ***выйграць****.*

Зайграць, пайграць, прайграць, дайграць.

### *Бібліятэка*

*1. Закрэсліце літару, якая сустракаецца часцей за астатнія. Расшыфруйце і запішыце слоўнікавае слова.*

БЕІБЕЛЕІЯЕТЕЭКЕА

*2. Злучыце склады так, каб атрымалася назва ўстановы, якая збірае і захоўвае кнігі, выдае іх чытачам.*

бі  о  те
блі  лі  тэ
біб  я  ка

*3. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.*

| | |
|---|---|
| Установа, якая збірае і захоўвае кнігі, выдае іх чытачам — гэта ______________. | бібліятэкар |
| Работнік бібліятэкі — гэта _____. | бібліятэка |

*4. Прачытайце сказ. Закрэсліце непатрэбныя літары ў дужках.*

Нацыянальная біблі(я/а)т(э/е)ка (б/Б)еларусі знаходзіцца ў (М/м)інску.

*5. Прачытайце верш. Дапішыце прапушчаныя літары ў выдзеленае слова.*

Дзень надарыцца няўдачны —
Не бядую і не плачу,
Супакой мой не ў аптэцы,
А ў маёй бібл___тэцы.

*Міхась Пазнякоў* [2, с. 44–45]

***Надáрыцца*** *— выдацца, выпасці.*

*У якім значэнні ўжываецца ў вершы выдзеленае слова? Адзначце правільны адказ.*

☐ Установа, якая збірае і захоўвае кнігі, выдае іх чытачам.

☐ Падабраны пэўным чынам збор кніг, які з'яўляецца чыёй-небудзь уласнасцю.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Крынічка: Чытанка : для дашк. і мал. шк. узросту / укл. Р. М. Міронава ; маст. Т. П. Беразенская. — Мінск : Маст. літ., 2009. — 167 с.
2. *Пазнякоў, М. П.* Святло дабрыні : азбука, лічэбнікі, лічылкі, вершы, скарагаворкі, каламбуры, загадкі, крылатыя выразы, казка : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / М. П. Пазнякоў. — Мінск : Звязда, 2015. — 320 с.
3. *Пазнякоў, М. П.* Радзіма : вершы : для дзяцей малодш. шк. узросту / Міхась Пазнякоў. — Мінск : Народная асвета, 2012. — 22 с.
4. *Галіноўская, Н. В.* Калі я шчаслівы : вершы, казкі, жарты, небыліцы : для дзяцей мал. шк. узросту / Н. В. Галіноўская ; маст. Галіна Хінка-Янушкевіч. — Мінск : Выдавецкі дом «Звязда», 2013. — 160 с.

**Крыніцы ілюстрацый:** http://pimg.mycdn.me/getImage?disableStub=true&type=VIDEO_S_720&url=https%3A%2F%2Fvdp.mycdn.me%2FgetImage%3Fid%3D182896625062%26idx%3D30%26thumbType%3D47%26f%3D1%26i%3D1&signatureToken=T1mHNcGP7Ll1cGTc-zUhxA; https://illustrators.ru/uploads/illustration/image/1095344/main_%D0%A1%D0%BE%D1%81%D0%BD%D0%B0.jpg.